УДК 378. 147

# Да пытання аб нацыянальных каштоўнасцях у працэсе выхавання моладзі

Макарыч М.В.
Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт

Адной з асноўных задач грамадства заўсёды было выхаванне моладзі, развіццё яе духоўных і маральных якасцей, патрыятызму і грамадзянскасці. На гэта накіравана ўся сістэма адукацыі ў нашай краіне. І гэта натуральна так: кожная дзяржава ў першую чаргу павінна клапаціцца пра такі накірунак выхавання, таму што любой краіне патрэбны адданыя ёй людзі, якія не толькі любяць той край, дзе нарадзіліся і жывуць, але і стараюцца зрабіць жыццё ў ім лепшым, больш уладкаваным і шчаслівым. Таму мэтай патрыятычнага выхавання грамадзян Беларусі з'яўляецца фарміраванне ў іх каштоўнаснага стаўлення да нацыянальнай спадчыны.

Агульначалавечыя каштоўнасьці ёсць, перш за ўсё, каштоўнасьці нацыі. Гэта сам чалавек, народ, мова, зямля (тэрыторыя, на якой жыве чалавек і народ), літаратура, дзяржава, сьцяг і г.д. Такім чынам вывучэнне нацыянальнай мовы і гісторыі свайго народа – неад’емная частка адукацыйнага працэсу.

Веданне гісторыі свайго краю дазваляе па-новаму асэнсаваць мінулае, сучаснае і прадставіць будучае, сфарміраваць неабходныя каштоўнасныя арыенціры. Таму выхаванне грамадзяніна, патрыёта неабходна ажыццяўляць праз вывучэнне сваіх каранёў і сваіх вытокаў. І педагогу трэба выконваць самую адказную місію – далучаць сваіх выхаванцаў да прыгажосці роднай мовы, культуры, выхоўваць павагу да гісторыі, традыцый роднага краю. Таму ў кожнай вну павінна праводзіцца актыўная работа па распрацоўцы адпаведнага навукова-метадычнага забеспячэння.

Усё вышэйсказанае датычыцца не толькі да вну гуманітарных напрамкаў. Відавочна, што якасная тэхнічная адукацыя не можа быць забяспечана без азнаямлення студэнтаў з сучаснымі тэхналогіямі. Аднак веданне дакладнай гісторыі іх стварэння і гістарычных асоб суайчыннікаў, якія іх разпрацавалі, можа выклікаць дадатковую цікаўнасць навучэнцаў і спрыяць працэсу пераемнасці ў навуцы. Напрыклад, вынаходніцтвы ў галіне распрацоўкі ракетнага паліва сусветнавядомага беларуса, доктара навук, прафесара Барыса Кіта. Альбо вывучэнне стандартных канструкцый ракет і запальных снарадаў, упершыню спраектаваных у 17-м стагоддзі ваенным інжэнерам беларусам Казімірам Семяновічам. Шмат іншай цікавай і каштоўнай інфармацыі навучэнцы БНТУ знойдуць у дапаможніку, распрацаваным на “Кафедры англійскай мовы № 2” и выдадзеным ў 2014 годзе.